

# «ЗА БЕЛАРУСЬ ВЫ МОЖАЦЕ БЫЦЬ АБСАЛЮТНА СПАКОЙНЫЯ»

**Аб духоўным і дзяржаўным гаварыў Прэзідэнт з прадстаяцелем Рускай праваслаўнай царквы**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ЧЭРВЕНЯ СУБОТА № 109 (30497)

# ЛЕТА — ДЗЕЦЯМ

Дзіцячыя лагеры па ўсёй Беларусі прынялі першых дзяўчынак і хлопчыкаў на аздараўленне. «Звязда» праверыла, які настрой у гэтым царстве прыгод і новых уражанняў.

## ВЫБАР, БЯСПЕКА, ДАСТУПНАСЦЬ

У Гродзенскай вобласці на працягу лета будуць працаваць 62 выхаваўча-аздараўленчыя лагеры, 15 спартыўна-аздараўленчых, 8 палатачных перасовачных з тэрмінам знаходжання 9 дзён, 71 палатачны стацыянарны з 12-дзённым знаходжаннем, дзённыя лагеры — усяго больш за **700 розных накіраванасці, дзе аздараўленне пройдуць тысячы дзяцей**.

СТАР. 8–9



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

ПРАЎДЗІВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ, ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ І АДКАЗНАСЦЬ 5



З НАГОДЫ

## ШЛЯХАМ ВЫЗВАЛІЦЕЛЯЎ

**Слаўгарадчане далучыліся да акцыі Мінабароны «Марш Перамогі»**



Учора ў Слаўгарадзе было вельмі ўрачыста і шматлюдна. Горад прымаў удзельнікаў акцыі «Марш Перамогі», якую Мінабароны прысвяціла 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Паглядзець на легендарныя танкі Т-34, ваенную амуніцыю, пазнаёміцца з прадстаўнікамі ваенных ВНУ прыйшлі сотні жыхароў горада і раёна, прыехалі госці з Расіі.

СТАР. 6

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

TikTok



Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2025 года

**Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

ISSN 1990 — 763X

25109

# «ЗА БЕЛАРУСЬ ВЫ МОЖАЦЕ БЫЦЬ

## Аб духоўным і дзяржаўным гаварыў Прэзідэнт

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам. У нашай краіне Патрыярх знаходзіцца са знакавай нагоды — святкавання 900-годдзя Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку. І сустрэча з беларускім лідарам пачалася ўрачыста: за ўклад у развіццё царкоўна-дзяржаўных адносін Патрыярх Кірыл узнагародзіў Аляксандра Лукашэнку ордэнам Святога Дабравернага князя Даніла Маскоўскага першай ступені.**



Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўсе яго ўзнагароды, у тым ліку і ордэн Андрэя Першазваннага, які яму ўручыў Уладзімір Пуцін, захоўваюцца ў Палацы Незалежнасці і выклікаюць вялікую цікавасць у яго наведвальнікаў. Як вядома, дзверы Палаца Незалежнасці адчынены для простых беларусаў. Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што ордэн, атрыманы з рук патрыярха, таксама зойме ганаровае месца.

### «МЫ СТАРАЕМСЯ ЗАПАВЕДЗІ ГОСПАДА НЕ ПАРУШАЦЬ»

Патрыярх Кірыл падзякаваў Аляксандру Лукашэнку ў першую чаргу за тое, як жыве Беларусь. Ён прызнаўся, што наша краіна — блізкая яго сэрцу. «Вялізныя перамены ў жыцці краіны, і не толькі эканамічныя, не толькі дабрабыт народа, але і агульная атмасфера, — адзначыў ён. — Будучы Мітрапалітам Смаленскім, у свой час я часта праязджаў праз Беларусь, бываў у Беларусі і магу параўнаць, якія велізарныя перамены адбыліся за гэты час. І ўсё гэта пры вашым кіраўніцтве. І я думаю, што многія рэчы былі вынікам вашага творчага ўяўлення, якімі павінны быць краіна, народ, горад. І гэта ўсё сапраўды рэалізоўваецца на карысць Беларусі».

Патрыярх падкрэсліў брацкія адносіны паміж беларускімі і рускімі народамі: «Для мяне вось гэты фактар сапраўднага сяброўства, узаемадапамогі з'яўляецца вельмі важным паказчыкам таго, што складваецца ў міждзяржаўных адносінах. Таму хацеў бы асабіста Вам падзякаваць, у Вашай асобе выказаць падзяку і ўдзячнасць усяму беларускаму народу».

Аляксандр Лукашэнка ў сваю чаргу заўважыў, што ўвесь свой шлях развіцця Беларусь прайшла на вачах Патрыярха Кірыла, які бачыў

# МЕНШ БЮРАКРАТЫЗМУ — БОЛЬШ

## Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 227 «Аб павышэнні эфектыўнасці кантрольнай

**Неабходныя новаўвядзенні ў гэтай сферы неаднаразова разглядаліся на ўзроўні кіраўніка дзяржавы. У сакавіку Аляксандру Лукашэнку прадставілі праект адпаведнага ўказа, дапрацаваны з улікам заўваг і прапаноў, выказаных на нарадзе ў маі мінулага года. Аднак Прэзідэнт адправіў дакумент на дапрацоўку. Адно з галоўных яго патрабаванняў датычылася зручнасці выкарыстання норм дакумента, змянення стылю і метадаў работы кантралюючых органаў з акцэнтам на павышэнне эфектыўнасці работы. Зацікаўленым дзяржорганам ставілася задача знайсці кампраміс, перагледзець падыходы і выдаць дакумент належнай якасці. Да гэтага пытання кіраўнік дзяржавы вяртаўся і на мінулым тыдні, падчас нарады з кіраўніцтвам Савета Міністраў.**

### ПАВЫШЭННЕ АДКАЗНАСЦІ І ЎЗМАЦНЕННЕ ПРАФІЛАКТЫКІ

Такім чынам, дакументам карэкціруецца парадак ажыццяўлення кантрольнай (наглядной) дзейнасці (дагэтуль яе рэгуляваў Указ ад 16 кастрычніка 2009 года № 510, што цяпер страціў сілу).

У новым указе прапісаны нормы, накіраваныя на зніжэнне ўзроўню бюракратызму, павышэнне лічбавізацыі працэсаў. Скасоўваецца абавязак суб'ектаў гаспадарання весці кнігу кантрольных (наглядных) мерапрыемстваў і журнал правядзення работ (такія звесткі ўжо ўносяцца ў інтэграваную аўтаматызаваную сістэму кантрольнай (наглядной) дзейнасці). Скасавана таксама вядзенне і выкарыстанне адзінай інфармацыйнай базы даных кантралюючых (наглядных) органаў.

Указам зацверджана Палажэнне аб парадку правядзення мерапрыемстваў тэхнічнага (тэхналагічнага, паверачнага) характару, якое ўстанаўлівае тэрміны, правы, абавязкі суб'ектаў і службовых асоб кантралюючых (наглядных) органаў.

Замацаваны нормы, якія датычацца мер адказнасці такіх органаў за парушэнне парадку правядзення праверак, маніторынгу, мерапрыемстваў тэхнічнага характару. Узмоцнена прафілактычная роля маніторынгу за кошт змянення падыходу да прымянення мер адказнасці (будуць прымяняцца толькі пры неўстараненні добраахвотна парушэнняў ва ўстаноўлены тэрмін пры кожным факце іх выяўлення).

Уведзены абавязак для правяраючых вызначаць тэрмін для ўстаранення выяўленых парушэнняў зыходзячы з іх спецыфікі. Будзе ўлічвацца пры гэтым аб'ектыўная магчымасць устаранення парушэння ва ўстаноўлены тэрмін.

Акрамя таго, прыведзена ў адпаведнасць з іншым заканадаўствам тэрміналогія, якая ўжываецца ў заканадаўстве аб кантрольнай (наглядной) дзейнасці.

### БЕЗ БЯЗДУМНЫХ, НЕАБГРУНТАВАНЫХ, НЕПАТРЭБНЫХ ПРАВЕРАК



Як адзначыў **генеральны пракурор Андрэй ШВЕД**, указ накіраваны на тое, каб спрасціць работу як кантралёраў, так і суб'ектаў, якія правяраюцца.

«Але самае галоўнае, аб чым неаднаразова гаварыў кіраўнік дзяржавы, — не павінна быць бяздумных, неабгрунтаваных, непатрэбных праверак, — акцэнтаваў увагу кіраўнік наглядного ведамства. — Неабходна зняць непатрэбны ціск на эканоміку, на суб'ектаў гаспадарання, на прадпрымальнікаў з тым, каб, як людзі гавораць, іх ніхто не кашмарыў і не перашкаджаў ім працаваць. Гэта самае галоўнае».

Пры распрацоўцы дакумента была прааналізавана практыка, абагульнены скаргі, заявы прадпрымальнікаў, суб'ектаў гаспадарання, бізнес-супольнасці — па дадзеных пытаннях, адпаведна, былі ўлічаны пажаданні.

«Фактычна з сённяшняга дня як кантралёры, так і тыя, каго правяраюць, знаходзяцца ў аднолькавым праваВым статусе і надзяляюцца аднолькавымі правамі і абавязкамі», — падкрэсліў генпракурор. Ён растлумачыў, што любая праверка можа пачынацца толькі з наяўнасці адпаведнага дакумента, у якім дакладна ўказаны час, мэта правядзення праверкі і хто гэта робіць. Любая праверка павінна заканчвацца выніковым дакументам.

Адказнасць за парушэнне палажэнняў указа ў роўнай ступені будуць несці як тыя, каго правяраюць, так і тыя, хто правярае. «Гэта значыць, калі правершчык выходзіць, напрыклад, за прадмет праверкі, за мэту праверкі, ён нясе за гэта адказнасць, — растлумачыў Андрэй Швед. — З іншага боку, суб'ект гаспадарання мае права яму адмовіць у прадастаўленні інфармацыі, дакументаў, сказаць, што да праверкі гэта не мае ніякага дачынення, і ён мае рацыю».

Далей выніковы дакумент можа, а ў некаторых выпадках павінен быць вывучаны суб'ектам гаспадарання, якія правяраецца. У яго ёсць шырокія правы на абскарджанне ў выпадку нязгоды з высновамі рэвізораў, выказванне сваіх прапаноў і г. д.

### ЗАБАРОНЕНА ПЕРАШКАДЖАЦЬ ПАЎСЯДЗЁННАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ДОБРАСУМЛЕННАГА СУБ'ЕКТА ГАСПАДАРАННЯ

Андрэй Швед заўважыў, што шмат скаргаў было наконт так званых маніторынгаў, і яны ўлічаны. Асобным палажэннем, якое зацверджана ўказам, маніторынг прапісаны вельмі дакладна, зразумела, як і сама праверка. Гэта значыць, любыя праверачныя мерапрыемствы сталі празрыстымі, выразнымі і зразумелымі, падкрэсліў ён.

Кіраўнік наглядного органа звярнуў увагу на тое, што таксама, як і праверка, маніторынг можа пачынацца толькі пры наяўнасці пэўнага дакумента, з указаннем, хто маніторыць, па якім пытанні праходзіць маніторынг і, адпаведна, павінен быць выніковы дакумент. Пры гэтым для таго, каб стварыць больш спрыяльныя ўмовы для эканомікі, суб'ектаў гаспадарання, па выніках маніторынгу прадугледжана вызваленне ад адказнасці, калі выяўленыя парушэнні ў ходзе маніторынгу аператыўна ліквідуюцца.

Ва ўказе ёсць шэраг іншых навацый, накіраваных на тое, каб без наяўнасці дакладнай інфармацыі, без неабходнасці прыняцця мер па ўстараненні нейкіх парушэнняў у дзейнасць суб'екта гаспадарання ніхто проста так не ўмешваўся.

Напрыклад, дакладна рэгламентавана забарона для правершчыкаў перашкаджаць паўсядзённай дзейнасці добрасумленнага суб'екта гаспадарання. «Калі суб'ект добрасумленна працуе, ён павінен працаваць.

# АБСАЛЮТНА СПАКОЙНЫЯ»

## з прадстаяцелем Рускай праваслаўнай царквы

і дрэннае, і добрае. «І для мяне вельмі каштоўныя вашы заўвагі і высновы, якія вы толькі што выказалі, — прызнаўся ён, падзякаваўшы прадстаяцелю Рускай праваслаўнай царквы за візіт у Беларусь. — Упэўнены, што сапраўды ў вашым сэрцы Беларусь, упэўнены, што вы аддаяце належнае спакою, цішыні, у якіх развіваецца наша краіна. Хоць вы бачыце (як бывала гэта раней, і нават на нашай з вамі памяці): не ўсё спакойна ў Беларусі. Заўсёды камусьці чагосьці хочацца, але мы стараемся запаведзі Госпада не парушаць у Беларусі, таму нам удаецца жыць больш-менш спакойна. Не скажу, што мы вельмі багатыя. Хто як можа, так і зарабляе з дапамогай Госпада. Але калі сам працуеш, Гасподзь дапамагае — мы гэту запаведзь памятаем, таму стараемся ў гэтым плане арганізоўваць наша жыццё. За Беларусь вы можаце быць абсалютна спакойныя».

### «ЦАРКВА — ГЭТА ВАЖНЫ ФАКТАР ЯДНАННЯ НАРОДА»

Прэзідэнт расказаў аб ініцыятыве стварыць у Беларусі цэнтры для кожнай рэлігійнай канфесіі. Для праваслаўя такім цэнтрам стане Жыровіцкі манастыр. Беларускі лідар адзначыў, што там ужо многае зроблена, каб гэта месца стала годным цэнтрам паломніцтва. «Жамчужына», — ацаніў патрыярх. Беларускі лідар звярнуў увагу, што становіца змяніўся не толькі манастыр, але і ў цэлым той край. «Нагогул усе землі, якія вакол. Уладыку аддалі — бярыце, апрацоўвайце там з людзьмі манастыра», — расказаў ён.

«Як Гасподзь сказаў Адаму ў раі: вось зямля — бяры і апрацоўвай», — заўважыў патрыярх. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такія цэнтры будуць створаны для ўсіх рэлігій, каб кожны знайшоў сваю дарогу да храма. «Мы рэалізоўваем гэтыя пачынанні. Я не бачу крыўды з боку і мусульман, і католікоў, і іўдзеяў. Я не бачу ніякіх праблем. Яны ўспрынялі гэта добра», — адзначыў ён.

Патрыярх Кірыл звярнуў увагу, што так і павінна быць. Паводле яго слоў, гэта традыцыйныя рэлігіі, ад якіх ніколі ніякіх адмоўных дзеянняў не ішло, у адрозненне ад рознага роду сект, якія накіраваны на раздзяленне народа. Ён растлумачыў, што ў аснове філасофіі сект — менавіта раздзяленне, што вельмі небяспечна і для рэлігійнага жыцця народа, і для дзяржавы. «А традыцыйныя рэлігіі не маюць такіх мэт. Руская праваслаўная царква, яе Беларускі экзархат — гэта вельмі важны фактар яднання народа, яднання людзей вакол высокіх мэт і каштоўнасцяў. І дзеянне Царквы заўсёды пазбаўлена якіх-небудзь палітычных мэт, што супярэчылі б інтарэсам народа і дзяржавы. За гэта нас заўсёды сёй-той крытыкаваў, таму што гэту лінію мы заўсёды падтрымлівалі. Не павінна быць у царкве ніякіх імкненняў да развіцця цэнтрабежных тэндэнцый у грамадстве. Наадварот, толькі да аб'яднання. Таму праваслаўная Царква, у дадзеным выпадку хачу сказаць пра Беларускую праваслаўную царкву, — гэта вельмі важная сіла, якая аб'ядноўвае беларускі народ і навучае людзей, якія гатовыя чуць слова Царквы, на тое, каб здзяйсняліся добрыя справы на карысць Айчыны, на карысць народа, на карысць сваёй сям'і і на выратаванне сваёй уласнай душы», — падкрэсліў Патрыярх Кірыл.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што ў пытанні работы з сектамі дзяржава арыентуецца на веды Царквы, якая заўсёды падкажа, што рабіць.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму



#### ПАТРЫЯРХ КІРЫЛ: «У БЕЛАРУСІ АДЧУВАЕШ, ШТО ТЫ СВОЙ СЯРОД СВАІХ»

Журналістам Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі прызнаўся, што адказваць на пытанне аб уражаннях ад Беларусі яму вельмі лёгка: «Калі прыязджаеш у Беларусь, адчуваеш, што ты свой сярод сваіх. Гэта краіна, якая бліжэй за ўсіх і па культуры, і па веры. І калі казаць аб нейкіх палітычных складніках, то і стратэгічны напрамак палітыкі дзвюх дзяржаў супадае. Таму ніякіх фактараў, якія маглі б азмрочыць знаходжанне на гэтай цудоўнай зямлі».

Журналісты пацікавіліся, ці абмяркоўваў Патрыярх з Прэзідэнтам Беларусі абмен палоннымі з украінскім бокам, у чым дапамагае і Беларусь. Патрыярх Кірыл адзначыў, што спецыяльна аб гэтым не гаварылі, але назваў дадзеную тэму вельмі важнай, паколькі размова ідзе аб лёсах людзей. «Царква заўжды стаяла на той пазіцыі, што, калі гэта магчыма, калі гэта не цягне небяспечныя наступствы, — трэба ажыццяўляць такія дзеянні, — адзначыў ён. — Вайна, нават калі размова ідзе аб высакародных мэтах, заўсёды суправаджаецца ахвярамі людзей. Таму ў Царквы не можа быць іншага пасылу акрамя таго, што, калі немагчыма скараціць пакуты, іх трэба мінімізаваць».

# ЛІЧБАВІЗАЦЫІ

## (наглядняй) дзейнасці»

Людзі павінны атрымліваць зарплату. Эканоміка павінна развівацца», — падкрэсліў генеральны пракурор.

Ен акцэнтаваў увагу на тым, што ўсе нававўвядзенні, якія прадугледжаны ўказам у мэтах выканання даручэння Прэзідэнта, накіраваны на выключэнне непатрэбных праверак. «З аднаго боку, не павінна быць непатрэбнага, залішняга ціску на эканоміку, бізнес, — канстатаваў ён. — З іншага, працэдура фіксацыі і рэагавання на выяўленыя парушэнні прапісана вельмі зразумела і дакладна».

### ВОЛЬНІЦЫ НЕ БУДЗЕ

Генпракурор дадаў, што прыняцце гэтага ўказа ні ў якім разе не мяняе палітыку работы кантралюючых (наглядных) органаў. Дзяржава абавязана выяўляць любыя парушэнні і рэагаваць на іх. «Гэта не азначае, што павінна быць нейкая вольніца — яе не будзе, — сказаў Андрэй Швед. — Вядома, мы разумеем, што праверачных мерапрыемстваў — кантрольных, наглядных — будзе менш. Але яны будуць больш эфектыўныя — на гэта накіраваны ўказ».

Суб'ект, які праваряецца, павінен разумець, што ў выпадку парушэнняў ён будзе несці адказнасць у строгай адпаведнасці з законам, заўважыў генпракурор. І дадаў, што тут патуранняў таксама быць не можа. Разам з тым ён падкрэсліў, што ўстанаўліваюцца больш дакладныя, празрыстыя, зразумелыя правілы, прыбіраецца лішняе, напрыклад, кніга ўліку праверак.

У сувязі з гэтым кіраўнік наглядняга органа адзначыў, што тая ж кніга ўліку праверак для прадпрымальнікаў, суб'ектаў гаспадарання была галаўным болем. Яе трэба было заводзіць, рэгістраваць у пэўных органах. Цяпер гэтага не спатрэбіцца. Лічбавізацыя і іншыя сучасныя працэсы дазволілі ў плане ўліку кантрольных і наглядных мерапрыемстваў увесці адзіную аўтаматызаваную сістэму, якая абслугоўваецца адпаведным органам. У той жа час самі суб'екты гаспадарання маюць права самастойна весці ўлік таго, хто і калі прыходзіць, весці ўлік маніторынгаў і іншых мерапрыемстваў пры наяўнасці законных падстаў іх правядзення.

### У АСНОВЕ — ПРАФІЛАКТЫКА

Адносна прафілактыкі правапарушэнняў, як падкрэсліў генпракурор, Прэзідэнт краіны асобна ўдзяліў увагу гэтаму пытанню. Акрамя таго, што неабходна спрасціць парадак, аблегчыць ціск з боку кантралюючых органаў, чырвонай ніткай праходзіць думка аб найважнейшай ролі прафілактыкі.

«Мы ўсе — кантралюючыя (наглядныя) органы — разумеем, што павінны дапамагаць нашым прадпрыемствам не дапускаць парушэнняў заканадаўства, недзе ім падказваць, — канстатаваў Андрэй Швед. — Паколькі вырашаецца агульная задача — павышэнне эфектыўнасці эканомікі любымі формамі і сродкамі. Але пры гэтым ніякага паслаблення не будзе тым, хто парушае закон».

### «ГЭТА ЗБАЛАНСАВАНЫ ДАКУМЕНТ»



Як звярнуў увагу **старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Васіль ГЕРАСІМАЎ**, апошнія змяненні ў заканадаўства аб кантрольнай дзейнасці ўносіліся 8 гадоў таму. Па яго словах, практыка паказала пэўныя шурпатасці, якія трэба было ліквідаваць.

«З 2020 года колькасць кантрольных мерапрыемстваў зменшылася ў два разы, — праінфармаваў Васіль Герасімаў. — Акцэнт зрушаны ў бок прафілактыкі. Але пры гэтым ёсць жорсткае патрабаванне кіраўніка дзяржавы: усё, што датычыцца жыцця і здароўя грамадзян, падаткаў і іншых сур'ёзных парушэнняў, — адказнасць павінна быць тая, якая прадугледжана законам».

Па яго словах, маніторынгі дэталёва ўрэгуляваны новым указам. «Для таго каб маніторынгамі не падмянялі праверкі, — адзначыў старшыня КДК. — Што датычыцца мерапрыемстваў тэхнічнага характару, то калі раней правілы ўстанаўліваў кожны орган, цяпер такога не будзе. Будуць адзіныя правілы. Мы павінны разумець, што маніторынгі і мерапрыемствы тэхнічнага характару (а гэта праверкі ліфтаў, абсталявання, машын) займаюць 96 % усіх кантрольных мерапрыемстваў. То-бок гэты пласт цяпер будзе ўрэгуляваны».

Кіраўнік Камітэта дзяржкантролю дадаў, што тэрміны для ўстаранення парушэнняў павінны быць адэкватныя. «На жаль, былі выпадкі, калі давалі на ліквідацыю парушэнняў, дзе аб'ектыўна патрабуецца некалькі тыдняў, дапусцім, два дні, — прывёў ён прыклад. — Ёсць шмат іншых тэхнічных правак, якія ўнесены ўказам у кантрольную дзейнасць».

Васіль Герасімаў падкрэсліў, што гэта збалансаваны дакумент. «Ён рыхтаваўся не толькі кантралюючымі (наглядными) органамі, але і з улікам меркавання суб'ектаў гаспадарання, — канстатаваў кіраўнік КДК. — Таму тое, што змяняецца ў плане маніторынгаў, мерапрыемстваў тэхнічнага характару, для суб'ектаў, вядома, лепш з пункту гледжання абароны іх інтарэсаў. Але ёсць рэчы, якія ўзмацняюць патрабаванні. Раней быў мараторый. Цяпер, напрыклад, што датычыцца цэнаўтварэння, калі мы бачым, што суб'ект сістэматычна парушае, то такія праверкі будуць магчымыя. Таму ў гэтым выпадку ўлічаны інтарэсы ўсіх».

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта і БелТА.**

АФІЦЫЙНА

### ПРЭЗІДЭНТ ПАДПІСАЎ УКАЗ АБ ДЗЕЙНАСЦІ Ў СФЕРЫ ГУЛЬНЯВОГА БІЗНЕСУ

**Указ № 226 «Аб дзейнасці ў сферы гульнявога бізнесу» накіраваны на ўпарадкаванне вядзення гульнявога бізнесу, узмацненне кантролю за ажыццяўленнем дадзенай дзейнасці, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Дакумент, у прыватнасці, узмацняе жорсткасць ідэнтыфікацыі ўдзельнікаў азартных гульняў. Іх рэгістрацыя ў віртуальных гульнявых установах будзе праходзіць альбо пры асабістым наведванні рэальнай гульнявой установы, або з дапамогай відэасеансу ў сетцы Інтэрнэт.

Таксама ўказам павялічаны тэрмін захоўвання запісаў камер відэаназірання ў гульнявых установах з 30 да 60 сутак з дня іх фіксацыі. Дадзена магчымасць эксплуатаваць гульнявыя аўтаматы, якія выкарыстоўваюцца больш за 10 гадоў, пры пацвярджэнні адпаведнасці іх тэхнічных характарыстык мадэлям, уключаным у Дзяржаўны рэестр мадэляў, дапушчаных да выкарыстання ў Беларусі.

Устанаўліваецца забарона гульцам мець больш за адзін гульнявы акаўнт, а таксама прымаць удзел у азартнай гульні па ўказанні трэціх асоб. Арганізатарам гульняў забаронена даваць электронныя карты, грошы і іншыя сродкі разлікаў пры адсутнасці ў наведвальнікаў неабходнай сумы. Банкі і небанкаўскія крэдытна-фінансавыя арганізацыі цяпер не маюць права ажыццяўляць перавод грашовых сродкаў фізічных асоб на карысць замежных арганізатараў азартных гульняў.

Ва ўказе таксама замацаваны меры па выкараненні злачынных схем у сферы гульнявога бізнесу. Так, выкарыстоўваць крыптавалюту для прыёму ставак і выплаты выйгрышу можна будзе выключна праз рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій, якія ажыццяўляюць дзейнасць аператара крыптаплатформы або па абмене крыптавалют. Акрамя таго, дакументам вызначаны механізм ідэнтыфікацыі прыналежнасці грашовых сродкаў фізічным асобам для іх допуску да ўдзелу ў азартных гульнях.

ІНАВАЦЫІ

# «НЕ АДСТАВАЦЬ, А ІСЦІ НАПЕРАД»

## Якія задачы акрэсліў Прэм'ер-міністр перад Паркам высокіх тэхналогій

**У пятніцу Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр Турчын правёў пасяджэнне Назіральнага савета Парка высокіх тэхналогій. Сярод галоўных пытанняў, якія сталі на парадку дня, — развіццё ПВТ, укараненне новых форм работы.**



«Парк высокіх тэхналогій — дасягненне нашай суверэннай краіны, дзецішча Прэзідэнта, — адзначыў Аляксандр Турчын. — Бо толькі пры ўдзеле, садзейнічанні кіраўніка дзяржавы Парк быў створаны і сёння развіваецца. Наша задача — рухацца наперад, укараняць новыя формы, новыя механізмы».

Кіраўнік беларускага ўрада звярнуў увагу: нягледзячы на ўсе складанасці, парк паспяхова працуе і расце:

**«Неабходна надаць гэтаму росту адпаведны дынамізм. Многае мяняецца ў свеце, асабліва ў сферы «лічбы»: кожны год, месяц, дзень, кожную хвіліну нешта адбываецца новае. Нам важна не адставаць, а рухацца наперад».**

Аляксандр Турчын адзначыў важнасць рэалізацыі адукацыйных праектаў, а таксама падтрымкі навуковай супольнасці, каб больш маладых людзей у розных сферах эканомікі змаглі атрымаць у Парку высокіх тэхналогій вопыт, падтрымку ва ўдасканаленні прафесійных кампетэнцый. «Таму сакратарыят парка павінен перастроіцца на больш актыўную, інтэнсіўную работу і ўсяляк аказваць і рэзідэнтам парка, і не толькі ім садзейнічанне ў развіцці», — падкрэсліў Прэм'ер-міністр.

Ён таксама прадставіў **начальніка сакратарыята Назіральнага савета ПВТ Ганну Рабаву** ўдзельнікам мерапрыемства і падкрэсліў, што яна чалавек, які сапраўды ведае і разумее, што такое «лічба».

У размове з журналістамі Ганна Рабава заявіла: «Парк высокіх тэхналогій — гэта асобная сутнасць, да якой прыкавана вялікая ўвага. А калі ўлічыць, што Назіральны савет ПВТ узначаліць Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын, — усё становіцца яшчэ больш важным і значным. Гэта сігнал для больш сур'ёзнай увагі да парка».

Ганна Рабава расказала і пра задачы, якія сёння стаяць перад Паркам высокіх тэхналогій: «Мінуў пэўны перыяд геапалітычнай турбулентнасці, парк крыху змяніў сваё аблічча. Лагічна, што трэба зрабіць чарговую пераацэнку, чэкінг: паглядзець нашы моцныя і слабыя бакі, якія з іх неабходна даразвіць, якія — скампенсаваць».

Адзін з найважнейшых кірункаў, абазначаных у тым ліку Прэм'ер-міністрам, — рэінвеставанне назапашанага патэнцыялу парка ў традыцыйныя галіны эканомікі. «Гэта сапраўды наймагутнейшы рэсурс. Нашы кампаніі вельмі актыўна цікавяцца ўнутраным рынкам, больш за палову з іх заяўляюць пра інтарэсы да рэсурсу краіны. Гэта каля 2,5 тысячы рашэнняў, якія, як яны лічаць, могуць быць укаранёны на ўнутраным контуры. Мы будзем выбудоўваць работу па адкрыцці празрыстага, інтэнсіўнага канала паступлення ўсіх гэтых рашэнняў у нашу традыцыйную галіну — сумесна з нашымі кампаніямі», — сказала начальнік сакратарыята Назіральнага савета ПВТ.

Другі, не менш важны кірунак работы Парка высокіх тэхналогій — узаемадзеянне з сістэмай адукацыі. Паводле слоў Ганны Рабавай, тут таксама ёсць свой пункт росту: «Айчынная адукацыя добра пазіцыянуецца ў свеце, карыстаецца цікавасцю ў моладзі, і наша задача — выбудаваць узаемадзеянне з сістэмай адукацыі, падтрымаць яе, рэалізаваць нейкія смелыя, новыя адукацыйныя ініцыятывы».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**

### Дарэчы

У Парка высокіх тэхналогій сёння 1026 рэзідэнтаў. 3 іх 30 % — замежныя цэнтры распрацоўкі і прадуктовыя кампаніі. 17 рэзідэнтаў ПВТ створаны з дзяржаўным удзелам. Працягвае павялічвацца колькасць новых кампаній у парку. Так, за 2024 год і I квартал 2025-га ў ПВТ зарэгістравана 139 новых рэзідэнтаў.

Сёння ў Парку высокіх тэхналогій працуе каля 59 тысяч чалавек. Аб'ём вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі рэзідэнтаў ПВТ па выніках трох месяцаў 2025 года перавысіў 2 мільярды рублёў. Па выніках 2024-га выручка рэзідэнтаў парка склала 7 мільярдаў 887 мільёнаў рублёў. Парк высокіх тэхналогій захоўвае сваю экспартную накіраванасць. За 2024 год экспарт склаў 1,8 мільярда долараў. За I квартал 2025-га гэты паказчык ужо перавысіў 459 мільёнаў долараў. Рост экспарту забяспечаны дзякуючы актыўным дзеянням кампаній-рэзідэнтаў па пашырэнні геаграфіі знешнеэканамічнай дзейнасці. Так, істотна вырасла доля краін СНД (у першую чаргу — Расіі) у агульным аб'ёме экспарту ПВТ.

Рынак Беларусі з'яўляецца прывабным для большай часткі рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій. Аб'ём рэалізацыі IT-прадуктаў і паслуг рэзідэнтамі ПВТ на ўнутраным рынку краіны ў 2024 годзе склаў каля двух мільярдаў рублёў. Іх выручка на ўнутраным рынку за I квартал 2025-га перавысіла 500 мільёнаў рублёў. Падатковыя плацяжы рэзідэнтаў парка за 2024 год папоўнілі бюджэт краіны на 667,6 мільёна рублёў. У I квартале 2025-га гэта сума склала 179,3 мільёна рублёў.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ЯКАСЦЬ ПАВІННА БЫЦЬ ВА ЎСІМ

## Прыярытэты заканатворчай дзейнасці ў гэтай сферы абазначылі сенатары

**Выязное пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі на тэму «Пяцігодка якасці: мэтавыя задачы і шляхі іх вырашэння» прайшло ў Беларускім дзяржаўным інстытуце стандартызацыі і сертыфікацыі.**



У пасяджэнні ўзялі ўдзел члены Прэзідыума Савета Рэспублікі, прадстаўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, старшыні абласных і Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, намеснікі старшынь абласных выканкамаў і Мінскага гарвыканкама, якія курыруюць пытанні прамысловага комплексу эканомікі, кіраўнікі прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі, кіраўнікі прадпрыемстваў з сістэмы Дзяржстандарту, члены Маладзёжнага савета пры Савеце Рэспублікі.

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** адзначыла, што рашэнне Прэзідэнта ўслед за Годам якасці абвясціць пяцігодку якасці было ўзважаным і правільным:

**«Таму што мы разумеем, якая цяпер сур'ёзная канкурэнцыя складваецца на рынках, нашы прадпрыемствы павінны выпускаць якасную прадукцыю. Разам з тым дзеянне ўказа аб пяцігодцы якасці распаўсюджваецца не толькі на тавары і эканоміку, але і на ўсе сферы нашага жыцця».**

Са слоў спікера Савета Рэспублікі, пры рэалізацыі мерапрыемстваў Года якасці ў многіх сферах дасягнуты добрыя паказчыкі. У прыватнасці, было адрамантавана 5 тысяч кіламетраў аўтамабільных дарог пры плане 4,3 тысячы кіламетраў. Акрамя таго, былі выкананы работы па мадэрнізацыі і ўзвядзенні 2,7 тысячы кіламетраў лініі электраперадач.

«Аб росце і якасці нашай прадукцыі таксама сведчыць дынаміка экспарту, — адзначыла Наталля Качанава. — Экспарт тавараў і паслуг па выніках 2024 года стаў рэкордным за 12 гадоў.

**І, як адзначыў кіраўнік дзяржавы пры ўручэнні сімвалаў Дзяржаўнага знака якасці, які ўручаўся ўпершыню ў суверэннай Беларусі, — вынікі Года якасці — гэта вынік дзесяцігоддзяў нашага развіцця».**

Але самазаспакойвацца нельга, падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі, неабходна рабіць усё для таго, каб не зніжаць якасць ва ўсіх сферах жыццядзейнасці. Звароты, з якімі людзі прыходзяць на прыёмы да парламентарыяў, сведчаць: ёсць пытанні да якасці правядзення работ, напрыклад, у сферы ЖКГ. «Для нас вельмі важна, каб пытанні якасці жыцця, дэмаграфічныя пытанні і шэраг іншых былі заканадаўча ўрэгуляваны і вырашаліся», — сказала Наталля Качанава.

Спікер дадала, што ў Беларусі ствараюцца прывабныя ўмовы для інвестыцый: «Мы разумеем, што работа па павышэнні якасці заўсёды спалучана з фінансаваннем, інвестыцыямі.

**Толькі за мінулы год у набыццё абсталявання, у тым ліку ў межах праграм тэхпераўзбраення і мадэрнізацыі, у цэлым па краіне інвеставана амаль 18 млрд рублёў. Таму мы, у тым ліку на заканадаўчым узроўні, ствараем прывабныя ўмовы для інвестыцый у мадэрнізацыю вытворчасці, асваенне новых відаў прадукцыі».**

На думку **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіслава ТАТАРЫНОВІЧА,** абмяркоўваць пытанні якасці неабходна як складовую частку распрацоўкі праграмных дакументаў сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступныя пяць гадоў. «Члены Савета Рэспублікі актыўна бяруць удзел у абмеркаванні гэтых пытанняў, — падкрэсліў ён. — Дзяржстандарт як орган-рэгулятар летась на разгляд парламента ўнёс два спецыяльныя законы («Аб акрэдытацыі ў Нацыянальнай сістэме акрэдытацыі Рэспублікі Беларусь», «Аб забеспячэнні адзінства вымярэнняў»), яны былі прыняты і з канца мінулага года ўступілі ў дзеянне. Зразумела, што прававое забеспячэнне не абмяжоўваецца толькі галіновым заканадаўствам. Таму што пытанні, якія датычацца забеспячэння сістэмы якасці, распрацоўкі стандартаў як умовы пацвярджэння якасці прадукцыі, работ, паслуг, з'яўляюцца складовай часткай галіновых праграм і стратэгій для любога міністэрства. І гэтаму аддадзена вельмі вялікая ўвага ўжо ў рамках новай праграмы дзейнасці ўрада, якая звязана, натуральна, з канцэпцыяй і Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця на найбліжэйшую пяцігодку. Спадзяёмся, што тыя рэкамендацыі і рашэнні, якія мы сёння вызначылі, дадуць магчымасць прадоўжыць сістэмную работу ў межах тых задач, якія вызначаны ўказам кіраўніка дзяржавы па пяцігодцы якасці».

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота БелТА.**

# ПРАЎДЗІВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ, ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ І АДКАЗНАСЦЬ

## V Форум медыйнай супольнасці Беларусі працягнуў сваю работу ў Гомелі

Форум — унікальная пляцоўка для абмену досведам, абмеркавання тэндэнцый і стратэгіі развіцця нацыянальнай інфармацыйнай прасторы, магчымасць па заслугах ацаніць уменні майстроў друкаванага слова, адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў прывітальным слове да ўдзельнікаў мерапрыемства. Яго на пленарным пасяджэнні агучыў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Пярцоў.

Менавіта па даручэнні кіраўніка дзяржавы медыяфорум у Гомелі значна пашырыў фармат работы і стаў сапраўды маштабнай падзеяй, якая аб'яднала журналістаў, медыякіраўнікоў і экспертаў, дзяржслужачых, якія ўдзельнічаюць у рэгуляванні медыясферы краіны, а таксама блогераў, прэс-сакратароў дзяржорганаў і найбуйнейшых арганізацый.



— Падчас кожнага форуму мы паказваем, што мы не проста сіла, здольная згуртавацца, але здольныя ў сваіх моцных руках трымаць усю медыяпрастору, фарміраваць медыяландшафт Рэспублікі Беларусь, — дадаў ад сябе **Уладзімір ПЯРЦОЎ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.**

У размове з журналістамі Уладзімір Пярцоў таксама падкрэсліў, што медыяфорум у Гомельскай вобласці арганізаваны з яшчэ большым маштабам.

«Учора ў розных раёнах Гомельскай вобласці прайшлі панэльныя дыскусіі, дзе журналісты рэгіянальных рэдакцый і цэнтральных СМІ маглі абмяняцца досведам. Упершыню былі запрошаны прэс-сакратары дзяржаўных органаў і арганізацый. Гэта важна, паколькі ўказам Прэзідэнта прадугледжваецца вельмі дакладнае ўзаемадзеянне паміж прэс-службамі і сродкамі масавай інфармацыі. У дастаткова кароткія тэрміны яны змаглі абмеркаваць алгарытмы, наладзіць непасрэдную сувязь паміж канкрэтнымі кіраўнікамі рэдакцый і прэс-службамі дзяржаўных органаў. Усё маштабна арганізавана. Ёсць вялікія прадстаўнічыя дэлегацыі з рэгіёнаў. Пры гэтым прайшлі выступленні не толькі запрошаных спікераў з цэнтральных рэспубліканскіх СМІ або экспертаў з блізкага замежжа — актыўна дзяліліся сваім вопытам і кіраўнікі рэгіянальных рэдакцый», — звярнуў увагу Уладзімір Пярцоў.

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў, што за мінулы час узровень рэгіянальных СМІ значна падрос.

«Ёсць вельмі дастойныя напрацоўкі, якімі можна падзяліцца, у тым ліку і з цэнтральнымі СМІ, і са сваімі калегамі з рэгіёнаў. У прынцыпе яны працуюць у розных умовах, але ва ўсіх, па вялікім рахунку, адны і тыя ж праблемы і тэхналогіі. Важна максімальна эфектыўна іх прымяняць, каб і ў далейшым максімальна наладжваць і ўмацоўваць кантакт з аўдыторыяй гледачоў, слухачоў і чытачоў», — сказаў ён.



На задачах, важных для захавання стабільнасці ў краіне, засяродзіў увагу **міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ:**

— Самая галоўная мэта — забяспечыць інфармацыйную бяспеку краіны. Таму што, як неаднаразова казаў і Прэзідэнт, калі мы з вамі сёння не будзем перамагаць у інфармацыйнай вайне, нам давядзецца ўвайсці ў гарачую фазу, у сапраўдную вайну. І гэта не пустыя словы.

Міністр адзначыў, што для перамогі на інфармацыйным фронце ў СМІ павінны быць усе віды зброі і інструментаў.

— У нас сёння новыя віды інфармацыйных інструментаў. Прыходзіць штучны інтэлект, блогеры, якія дапаўняюць СМІ, гэта ўжо іншы від інфармацыйнай зброі. Таму краіне, міністэрству абавязкова варта ўсе гэтыя віды культываваць, — лічыць Марат Маркаў.

**Старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО** адзначыў:



— Разумеем, што журналісты — тавар штучны, таму робім стаўку на пошук і раскрыццё маладых талентаў. У рэгіёне 23 клубы юных журналістаў. Больш за 220 школьнікаў навучаюцца асновам медыявытворчасці, робяць першыя блогі. Галоўнае — навучыць не «перапісваць» навіны, а з разуменнем ставіцца да фактаў і падзей, улічваць экспертныя меркаванні, — перакананы губернатар.

Форум традыцыйна — не толькі свята айчыннай медыяпрасторы, але і жывы працоўны працэс. У абласным грамадска-культурным цэнтры разгарнуліся выязныя тэлестудыі, удзельнікі ў прамым эфіры дзяліліся ўражаннямі. Можна было ацаніць таксама выставачныя праекты СМІ краіны, прысвечаныя 80-годдзю Вялікай Перамогі, у тым ліку праект Выдавецкага дома «Звязда».

У рамках форуму ў абласной бібліятэцы прайшоў фестываль кнігі «#Чытай, Гомель». Яго тэма — 80-годдзе Вялікай Перамогі. Канешне, былі прадстаўлены на ім і кнігі Выдавецкага дома «Звязда».

— Для нас, прадстаўнікоў аднаго з найстарэйшых выданняў краіны з больш як стагадовай гісторыяй, асабліва важна захоўваць сувязь пакаленняў і традыцыі якаснай журналістыкі. Форум — гэта пляцоўка, дзе мы абмяркоўваем не толькі фарматы і платформы, але і сэнсы: дзеля чаго працуем, што пакідаем пасля сябе, — адзначыла **дырэктар — галоўны рэдактар РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» Вольга АНУФРЫЕВА.**

Завяршыўся медыяфорум урачыстай цырымоніяй узнагароджання пераможцаў і лаўрэатаў XXI Нацыянальнага конкурсу «Залатая літара». Сёлета да ўдзелу ў 25 намінацыях было пададзена больш за 440 работ, а гэта на 100 работ больш, чым летась. Больш як 300 заявак на конкурс паступіла з рэгіёнаў. **У знакавай намінацыі гэтага года «Найлепшыя матэрыялы па тэматыцы 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне»** пераможцам сярод рэспубліканскіх выданняў прызнаны Алег Усачоў з Выдавецкага дома «Беларусь сегодня», **праект газеты «Звязда» «Шляхамі вызвалення» стаў лаўрэатам.** Сярод рэгіянальных выданняў перамагла — рэдакцыя газеты «Перспектыва» (Гродзенскі раён) з праектам «Жаночы твар вайны», сярод ведамасных (карпаратыўных) СМІ, сеткавых выданняў — рэдакцыя газеты «Культура» (РВУ «Культура і мастацтва») з праектам «Векапомнае праз кінакадр».

Гран-пры конкурсу сярод рэспубліканскіх выданняў атрымаў спецыяльны праект «Суперпазіцыя. Паралельныя сусветы» РУП «Беларускае тэлеграфнае агенцтва», сярод рэгіянальных выданняў — праект «Побач з ПЕРШЫМ: 30 гадоў дзень за днём» рэдакцыі газеты «Зара над Сожам» (Кармянскі раён Гомельскай вобласці).

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота БелТА.**




ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | **ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29** |

**Предмет публичных торгов (электронного аукциона)**

**Повторные публичные торги в форме электронного аукциона. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 22.05.2025 в газете Звязда № 97 (30485), стр. 13**

| Лот № | Наименование | Начальная цена | Минимальная цена |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение (квартира) 2 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 93,9 кв. м. Количество жилых комнат: 3 | 228 313,14 бел. руб. без НДС | 159 819,20 бел. руб. без НДС |
| 2 | Изолированное помещение (квартира) 21 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 160,3 кв. м. Количество жилых комнат: 5, этаж: 5-й и 6-й | 353 200,40 бел. руб. без НДС | 247 240,28 бел. руб. без НДС |
| 3 | Изолированное помещение (квартира) 23 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 121,5 кв. м. Количество жилых комнат: 4 | 288 141,33 бел. руб. без НДС | 201 698,93 бел. руб. без НДС |
| 4 | Изолированное помещение (квартира) 25 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 121,2 кв. м. Количество жилых комнат: 4 | 287 487,47 бел. руб. без НДС | 201 241,23 бел. руб. без НДС |
| 5 | Изолированное помещение (квартира) 26 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 115,2 кв. м. Количество жилых комнат: 4 | 273 102,55 бел. руб. без НДС | 191 171,79 бел. руб. без НДС |
| 6 | Капитальное строение с инвентарным номером № 130/С-51297, общей площадью 179,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский район, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Ленина, д. 63 | 28 528,00 бел. руб. с учетом НДС 20 % | 5 705,60 бел. руб. с учетом НДС 20 % |
| 7 | Капитальное строение с инвентарным номером № 130/С-25779, общей площадью 163,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский район, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Ленина, д. 65 | 25 528,00 бел. руб. с учетом НДС 20 % | 5 105,60 бел. руб. с учетом НДС 20 % |
| 8 | Капитальное строение с инв. № 130/С-3660, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Ленина, д. 6/ 3, общ. пл. 470,7 кв. м | 46 283,94 бел. руб. с учетом НДС 20 % | 9 256,79 бел. руб. с учетом НДС 20 % |
| 9 | Капитальное строение с инв. № 130/С-3662, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Ленина, д. 6/ 2, общ. пл. 77,3 кв. м | 4 983,94 бел. руб. с учетом НДС 20 % | 996,79 бел. руб. с учетом НДС 20 % |
| 10 | Капитальное строение с инв. № 130/С-19112, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Ленина, д. 6/ 1, общ. пл. 25,3 кв. м | 3 083,94 бел. руб. с учетом НДС 20 % | 616,79 бел. руб. с учетом НДС 20 % |
| 11 | Капитальное строение с инвентарным номером № 130/С-50804, общей площадью 307,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский район, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Дзержинского, д. 19/1 | 26 830,52 бел. руб. с учетом НДС 20 % | 5 366,10 бел. руб. с учетом НДС 20 % |
| 12 | Капитальное строение с инв. № 130/С-44847, общей площадью 193 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский район, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Дзержинского, д. 1 | 28 930,52 бел. руб. с учетом НДС 20 % | 5 786,10 бел. руб. с учетом НДС 20 % |

**Задаток:** 5 % от начальной цены предмета электронного аукциона. В белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций».**

**Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота (не изменяется в ходе торгов)

Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи – 10 (десять) рабочих дней** после электронного аукциона

**Условия оплаты предмета электронного аукциона – 10 (десять) рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты имущества.
**Переход права собственности** – после полной оплаты имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресам: https://iintorgi.by**

Победитель электронного аукциона либо единственный участник, которому будет предложен для приобретения предмет электронного аукциона (претендент на покупку), обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 0,7 % от конечной цены продажи лота, но не менее 200,00 бел. руб. в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее, чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 17.06.2025, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00.
Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 07.06.2025 с 09:00 по 16.06.2025 г. до 17.00.
Электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Аукцион состоится **31.07.2025 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Сторожовская, 6.

Форма проведения аукциона – очная.

Место проведения: г. Минск, ул. Сторожовская, 6, 3 этаж.

Объект аукциона – нижеуказанное недвижимое имущество (продается одним лотом)

Месторасположение объекта аукциона по адресу: **Витебская область, Полоцкий район, Гомельский с/с, берег озера Суя на земельном участке площадью 3,2374 га**

**Начальная цена объекта 20 000,00 бел. руб. с НДС по ставке 20 %.**

**Размер задатка, порядок оплаты: 7 000,00 бел. руб. в безналичном порядке на счет Организатора (указан ниже) не позднее 28.07.2025.**

**Шаг аукциона – 15 %**

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником)

Организатор и продавец – ООО «Гостевой дом», УНП 691532819, 220080, г. Минск, ул. МКАД, 303, пом. 2П, BY51ALFA30122164900140270000 в ЗАО «Альфа-Банк», ALFABY2X

Заявки принимаются ежедневно по адресу: gostevoidom@strateg.by и (или) по вышеуказанному почтовому адресу ООО «Гостевой дом».

**Последний день приема заявок – 28.07.2025.**

Дополнительная информация доступна по телефону +375 29 178 46 94.

| Наименование объекта | Площадь кв. м |
|---|---|
| Летний домик № 1 | 39,4 |
| Летний домик № 2 | 9,1 |
| Летний домик № 3 | 9,0 |
| Летний домик № 4 | 9,1 |
| Летний домик № 5 | 35 |
| Летний домик № 6 | 9,1 |
| Летний домик № 7 | 22,5 |
| Летний домик № 8 | 35,1 |
| Летний домик № 9 | 22,5 |
| Летний домик № 10 | 23,2 |
| Летний домик № 14 | 19,8 |
| Летний домик № 15 | 19,9 |
